# КЛЮЧЫ — АД ШЧАСЦЯ...

## І няшчасця

**...Некалі, гасцюючы ў нашмат старэйшай сяброўкі, спрабавала не толькі нешта прыгатаваць ды падаць на стол, — парывалася вымыць посуд. «Не... Гэта лішняе», — тонам, што не зносіць пярэчанняў, казала гаспадыня. І з усмешкай дадавала:**

**— Не пазбаўляйце мяне задавальнення.**

**Мыла, значыць, сама, потым — расстаўляла на звычныя месцы. Што, магчыма, цікава — усё чыста прымала з пліты і клала на яе адмысловую льняную сурвэтку. Так, лічыла, і здаравей (не брудзіцца), і прыгажэй.**

**Хто б спрачаўся?..**

**...На новым старым ручнічку, які надоечы паклала на пліту, намаляваныя свечкі, шампанскае, вінаград, пад імі — удалы надпіс «Са святам!».**

**Гэта значыць раніцай прачнуўся, прачытаў, перш чым гатаваць сняданак, і як быццам павіншаваны! З тым, што даў бог яшчэ адзін дзень, дом, ежу... Найлепшую кампанію... Ну ці ж не свята?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Гаспадыня

Па ўбываючай: дзяцей у бабы Нюры чацвёра, унукаў — дарослых — пяцёра, праўнучка — адна (пакуль), але якая!

Днямі разам з бацькамі на вячэру прыязджала, на талерцы з паўлыжкі бульбы пакінула.

— Можа, даела б? — спытала бабуля.

— Цяпер — не хачу, але ты яе не выкідвай, — загадала малеча. — У халадзільнік пастаў. Заўтра з раніцы ўстанеш, дзверцы адчыніш: а там — ежа. Гатовая... Табе застанецца толькі разагрэць...

Ну ці ж не гаспадыня?!

### На змену

У знаёмых падворак — як той каўчэг, бо ўсякай пачвары па пары: свінка з парсючком, авечка з бараном, каза з казлом, сучка з сабакам... Напрадвесні індык з індычкай з'явіліся — Вася і Люся, а следам — пяцёрка малых.

Маці, што называецца, душы ў іх не чула: неадступна песціла-аберагала, штосьці смачнае падсоўвала, навучала... Бацька — як прыкмячаў гаспадар — хіба «для мэблі» быў — хадзіў галаву задраўшы ды толькі клекатаў: «Во якія дзеці! Во якая жонка!»

Выхваляўся, карацей, анічога пры тым не робячы, аж да той пары, пакуль... было за кім: пакуль індычку знoў не пасадзілі на яйкі.

Хвалько тады — анічога не зразумеў: абурыўся, разгубіўся, пакрычаў, што будзе скардзіцца, але ж потым зглядзеў пабач «сірот» і...

Адкуль што ўзялося? Клапоціцца, выхоўвае, глядзіць дзяцей. Прычым, як ні дзіўна, умеючы, нават не горш за маці.

...У птушак — як у людзей: як у тых жа Люсі і Васі.

Ці нават лепш?

### Сіла прывычкі

Каляжанка на заслужаны адпачынак пайшла, прычым столькі гадоў адпрацаваўшы...

А таму пры сустрэчы першае ж пытанне: як ёй у новай якасці? Ці прывыкла?

— Без работы — за тыдзень, — смяецца жанчына. — А вось без зарплаты — прывыкаць ды прывыкаць яшчэ.

Трэба разумець, нялёгкі працэс?

### Каму што...

Горад. Крама. Ланцужок да касы. У ім за намі — прывабная маладзічка з дзецьмі.

— Так: што нам бабуля сказала купіць? — засяроджана пытаецца яна не тое ў сябе, не тое ў сыноў. — Мы ўсё з вамі ўзялі?

— Пэпсі-кола і чыпсы тут! — рапартуе старэйшы хлопчык.

— І маёзіва тут! — хваліцца малодшы.

— Хлеб, пельмені, масла, капусту, — перабірае ў вазку матуля, — мы таксама ўзялі...

— Гэта — бабулі! — на ўсю краму абвяшчае малы. — А гаейку дзеду — забылiся?!

— Вось гэта — унук! Вось гэта малайчына! — адзываецца нехта з чаргі. — З такім — дзед ніколі не прападзе!

...У хуткім часе — магчыма.

А накошт «ніколі»...

Дай бог!

### Гадуй, дзядуля, унукаў

З ліста: «Нам з жонкай добра за 80, жывём у сталіцы, удваіх, нікому не замінаем. Са старэйшым сынам бачымся разы два на год — ён далекавата жыве. Не ў Мінску і малодшы. Тут, у нас прапісаны — хіба дарослы ўнук. Мы з жонкай дапамагалі гадаваць яго, абжывацца, падымацца на ногі... Спадзяваліся, што, можа, і ён дапаможа, калі тое спатрэбіцца: у аптэку сходзіць, тую ж шклянку вады падасць.

Ён і праўда чалавек неблагі, зрэдку забягае. Вось і нядаўна быў: прайшоўся па кватэры, трошкі пасядзеў-павячэраў, спытаў пра ўзрост, пра здароўе.

Мы пра яго няшмат што казалі — не скардзіліся, бо які ў гэтым сэнс: унук жа не доктар? Але ён усё роўна захваляваўся, «западозрыў нядобрае», сказаў: «Нешта ж доўга вы жывяце?!»

### Новыя людзі

Анекдот, а можа, і праўда.

У адным з нашых мястэчак турысты тутэйшага дзеда спынілі: сталі распытваць, ці ёсць тут якія славутасці, што ім варта было б паглядзець?

Дзед ім дарогу да царквы паказаў, да касцёла, сказаў, што ў іх яшчэ трое могілак ёсць: руская, польская і яўрэйская. «А беларусаў дзе хаваюць?» — спыталі заезджыя. «Беларусы — не паміраюць!» — хітра ўсміхнуўся дзед.

...Яўрэі ў большасці нашых мястэчак, мусіць, таксама, бо пасля апошняй (дай бог!) вайны іх проста не засталося — могілкі амаль не дагдядаюцца.

Але ж напрадвесні на іх нехта быў і, мусіць, запалку кінуў, — загарэлася трава. Людзі кінуліся тушыць.

...У сваім гародзе, непадалёк, хіба цётка адна заставалася: як нічога-ніякага — ускопвала граду.

— Калі не ідзяце тушыць, дык хоць рыдлёўкі дайце! — папрасіла ў яе адна з жанчын.

— І не пайду, і не дам, — адказала ёй цётка. — Бо не я тую траву падпаліла і не ў мой бок сягоння вецер...

Усё лагічна: старое мястэчка — новыя людзі.

### Чароўная сіла?

Загавары ў Мінску — на вакзале, у краме, у трамваі — па-кітайску ці па-японску, на цябе хіба вокам кінуць. Загавары (як мы з калегам) па-беларуску, — «усе вушы тут». І вочы, здаецца, таксама. Ва ўсякім разе, дзядзька, што расеўся паблізу, глядзіць, не міргаючы, ловіць кожнае слоўца і пасля чарговага ўсё ж зрываецца:

— Вы, канешна, звініце, — кажа на ўсю пляцоўку трамвая, — але я ў беларускай школе вучыўся, у дзярэўні рос, і так, як вы, там ніхто не разгаварываў... «Насамрэч» ды «насамрэч»... Тожа мне — слова прыдумалі... А што яно азначае, калі з трох часцей састаіць: на, сам і рэч. Вешч, кажучы па-руску! А прычым тут яна?!

Дзядзька абураны, дзядзька пытаецца і (гэта відавочна) чакае адказу.

А што яму сказаць? Што яго вёска і яго школа — гэта мінулае стагоддзе і далёка не ўся Беларусь? Што слова «насамрэч» (і нават «насамперш») у мове ёсць, і што дзяліць іх на нейкія часткі (ды асобныя з іх яшчэ перакладаць), мякка кажучы, — абсурд...

Рой думак — у мяне. У калегі — толькі ўсмешка:

— Скажыце, — звяртаецца ён да дзядзькі, — а ці было ў вашай вёсцы слова «ўпоперак»?

— А як жа, было, — гаварыцца той. — І «ўздоўж» было, і «ўпоперак»...

— А яго падзяліць вы не спрабавалі?

— Не, — нічога не разумеючы, гаворыць дзядзька.

— А вы паспрабуйце — як насамрэч, на тры часткі...

...Пасажыры ўсміхаюцца, мы выходзім, дзядзька едзе далей і, напэўна ж, «дзеліць».

Нехта недурны казаў, што смеху баіцца нават той, хто не баіцца нічога.

### Не прайшло... паўстагоддзя

Гэта, кажуць, не анекдот: знакаміты мастак, убачыўшы маляваныя дываны, загарэўся, пайшоў па інстанцыях — стаў прабіваць ідэю стварэння музея: даводзіць чыноўнікам, што сорак дываной мастачкі Алены Кіш — гэта цэлая калекцыя, гэта — скарб, які трэба выстаўляць!

А яму як быццам і не пярэчылі, — наадварот:

— *Да-да, конечно!* — казалі ў чарговым кабінеце. — *Проблема только с помещением... Надо подумать, где же разместить эти сорок диванов...*

Добрая навіна: памяшканні, нарэшце, знайшліся, у нас цяпер ёсць музей так званага наіўнага мастацтва!

Што радуе і здзіўляе — пры жыцці аўтара ідзі.

### Што вінен, аддаць павінен

У будныя дні Піліпаўна жыве адна, у выхадныя — на хутар да яе хоць нехта ды прыязджае: найчасцей — сынок са сваімі... І тады ўжо нявестка — яна ж маладзейшая — гаспадарыць на кухні: гатуе, ставіць на стол, склікае на снеданне і абед, на вячэру.

— Ну што за чалавек! — чарговы раз злуецца на мужа. — Есці — ніколі не даклікацца! Усё зраблю, паставлю — «Васечка, ідзі...» А ён і вухам не вядзе! То яму дарабіць нешта трэба, то дачытаць, то пагаліцца, ціск памераць...

— Ён змалку ў нас такі, — усміхаецца свякроў. — Спаць яго ўсёй сям'ёй укладвалі! То яму вадзічкі ахвота, то сікі, то какі, то цацку падай, то на пальчык пафукай... Я, бывала, так натупаюся, так натамлюся за дзень, што, здаецца, і свет не мілы! Але ж ён маленькі, шкада — вось і нашу яму то вадзічкі, то малачка, вось і фукаю на ўсе пальчыкі па чарзе ды спінку соннаму чухаю.

...Цяпер — у тры пагібелі сагнуўшы яе, ды такую шырокую, пад адчыненым акном у кухню — Васіль (і даўно ўжо Пятровіч) капае траншэю — пракладвае трубы для паліву град і, вядома ж, слухае гамонку жанчын, якія заўсёды любілі і любяць яго.

І якіх — гэтак жа бясконца! — любіць ён сам.

### За дабро — дабром?

Дачу Дзіна Макараўна будавала даўно, гадоў 30 таму, калі прыкладна столькі ж было і самой, і мужу. Гэта ён (светлай памяці!) карчаваў хмызняк на ўзлеску, узнімаў цаліну, садзіў яблыні ды грушы, будаваў дамок, а з часам — яшчэ і гараж, у які аднойчы вечарам пайшоў рамантаваць машыну і назад не вярнуўся: сэрца.

Мусіць, лёгкая была смерць?

Пра жыццё ўдавы такога не скажаш, бо адна і таксама нездаровая, бо жыве на больш чым сціплую пенсію, з усіх сіл стараецца трымаць парадак у кватэры і на той самай дачы: даглядае сад, нешта вырошвае на градках і ў цяпліцы, шчодра дзеліцца з суседзямі, бо ў тых (прынамсі, што злева) амаль нічога не расце: забываюцца — то пасадзіць, то дагледзець... (Узяць, — ніколі! І ўсё, што ні дай!)

А таму надоечы, адхварэўшы на ковід (ндзе ж не дзенешся?!), распачаўшы касьбу, дачніца верыла, што нехта з мужчын зараз прыйдзе на гук і яе падменіць...

Хутка змогшыся і нікога не прычакаўшы, яна кінула трымер: што называецца, пайшла на паклон.

Першы ціхі шок быў, калі сусед (той самы, «левы», які гадамі і вёдрамі браў для сям'і гародніну, вішні, парэчкі, не кажучы пра садавіну...) папрасіў за работу 50 рублёў і пляшку «беленькай», другі — калі ўбачыла, што траву скасіў збольшага — абы-як, абы адчапіцца...

Нехта недурны сказаў, што рабіць добра — гэта ключ да шчасця.

Ключ да няшчасця — чакаць ад людзей удзячнасці.

### Пакуль збіраўся жыць...

З вёскі, што ляжыць у нізінцы, каля самай рэчкі, на ровары выязджаць цяжкавата, бо ўвесь час пад гару: пакуль «возьмеш» яе, досыць добра натомішся і затым хоць-нехаць пастаіш, паглядзіш назад — на дамы і дамкі, на блізкія могілкі: помнікі на іх — як пастаці...

Каля адных — хочацца ўкленчыць, схіліць галаву, абняць, каля іншых — проста пастаяць, углядзецца ў прыгожыя твары (а колькі ж маладых?!), прачытаць знаёмыя прозвішчы, звычныя літары ЗП (чытай «здесь покоится») і РБ («раб божий»)...

Што цікава, гэтымі ж дзвюма — РБ — ва ўсіх нататніках і заўжды пазначаліся любімыя радкі Рыгора Барадуліна.

*«Пакуль збіраўся жыць,*
*Жыццё прайшло...»*

Гэта з яго...

Можа, пра тых, хто сышоў у найлепшы свет і цяпер «покоится»? Можа, пра тых, хто яшчэ збіраецца жыць — некалі.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж.**

*У старых беларускіх календарах чаго толькі не было!.. У тым ліку — чыстыя старонaчкі для запісаў.*

*Можна сказаць, адтуль на роздум: дзякуйце лёсу за сужэнца, што храпе пад бокам, — значыць, ён не ў каханкі; дзякуйце за посуд, які трэба мыць пасля гасцей, — значыць, маеце радню і сяброў; за адзенне, якое робіцца малаватым, — значыць, у вас ёсць ежа; за гару мыцця, — значыць, у вашай сям'і ёсць што насіць; за свавольства дзяцей, — значыць, Бог вам іх даў, за стому ў канцы дня, — значыць, вы яшчэ можаце добра папрацаваць; за будзільнік, што звініць штораніцы, — значыць, вы жывыя.*